РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІПЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 140 (30528)

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ХТО ПЕРАМАГАЕ Ў БІТВЕ ЗА ЎРАДЖАЙ

## Эксперты — аб галоўным летнім чэленджы ад кіраўніка дзяржавы

У сераду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання паведаміла, што ў Беларусі намалацілі першы мільён тон збожжа. І гэта больш чым проста лічбы. Гэта дабрабыт краіны. Сельская гаспадарка і сітуацыя на палях заўсёды ў полі зроку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — гэта не сакрэт. Але ў перыяд уборачнай кампаніі ўвага ўзрастае ў разы. І не проста так, бо ўборачная — гэта не толькі шматгадзінная праца тысяч людзей па ўсёй краіне (што і так шмат), але і, як адзначыў кіраўнік дзяржавы на нядаўняй селектарнай нарадзе, — найважнейшы этап сельскагаспадарчых работ, які вызначыць вагу рэспубліканскага каравая сёлета. Разам з экспертамі разбіраліся, чаму беларускі выбар «ваяваць на хлебных палях» — адзіны правільны варыянт.

### ПАДМУРАК СУВЕРЭНІТЭТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

«У Беларусі ўборачная кампанія мае асаблівае значэнне, і Прэзідэнт Беларусі не раз падкрэсліваў, чаму ён асабіста ўдзяляе ёй столькі ўвагі. Сёння мы бачым, якая непрадказальная геапалітычная абстаноўка, а сусветныя рынкі схільныя да ваганняў. Таму здольнасць нашай краіны самастойна забяспечваць сябе асноўнымі прадуктамі харчавання з'яўляецца падмуркам суверэнітэту і незалежнасці. Беларусь імкнецца да самадастатковасці ў вытворчасці збожжа, бульбы, агародніны і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі. Паспяховая ўборачная кампанія гарантуе, што на сталах беларусаў заўсёды будзе дастаткова хлеба, мяса, малака і іншых жыццёва важных прадуктаў. Гэта не толькі пытанне камфорту, але і пытанне нацыянальнай бяспекі. Калі краіна можа пракарміць сябе, яна становіцца менш уразлівай перад знешнім ціскам і эканамічнымі крызісамі», — адзначыў **Аляксандр ГАРОШКІН, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.**



Цытату кіраўніка дзяржавы «Лепш ваяваць на хлебным полі» сенатар назваў метафарай устойлівасці і самадастатковасці. «Ваяваць на хлебным полі» — гэта не пра літаральныя ваенныя дзеянні, а пра ўменне беларускага народа забяспечыць сябе ўсім неабходным, быць незалежнымі ад знешніх паставак і мець трывалы тыл. Гэта інвестыцыя ў будучыню, у стабільнасць і дабрабыт кожнага грамадзяніна», — падсумаваў Аляксандр Гарошкін.

### АБ'ЕКТЫЎНУЮ РЭАЛЬНАСЦЬ СКАРЭКЦІРУЕ ДЫСЦЫПЛІНА

Укладваць сілы і душу ў правядзенне ўборачнай кампаніі — гэта яшчэ і укладвацца ў эканамічную стабільнасць. Для дзяржавы галоўнае — эканоміка. Для чалавека галоўнае — харчаванне. «Збожжа сёння падобна да золатавалютных рэзерваў. Заўсёды спатрэбіцца і пастаянна расце ў цане. Прынамсі, такіх цэн на сусветным рынку, як учора і сёння, не было і не будзе. Гэта дакладна. І калі ў нас ёсць свабодныя магутнасці, чаму б іх не запоўніць рэзервам збожжа. Для таго каб забяспечыць уласную харчовую бяспеку, каб на стале ў нас, як кажуць у народзе, быў «і хлеб, і да хлеба», — адзначаў Аляксандр Лукашэнка на селектарнай нарадзе, прысвечанай уборачнай кампаніі ў 2023 годзе. Час ідзе — падыходы не мяняюцца. І патрабаванні да адказнага правядзення ўборкі ўраджаю таксама. Падыходы і патрабаванні спецыялісты добра разумеюць.

СТАР. 2



Фота БелТА.

ЖНІВА-2025

# «ЛЕНАВАЦЦА НЕ ТРЭБА, ТАДЫ ЎСЁ БУДЗЕ»

## Просты сакрэт поспеху ад хлебаробаў, за якім стаіць нялёгкая праца

Жніво паступова набірае абароты. Кожная хвіліна — на вагу золата. Каб максімальна эфектыўна, хутка і з мінімальнымі стратамі ўбраць ураджай, механізатары і іх памочнікі гатовыя працаваць ад цямна да цямна. І гэта не проста словы — для тых, хто на палях, гэта рытм жыцця. Задачу арганізаваць работу аграрыя, нягледзячы на даволі няпростыя ўмовы надвор'я, Прэзідэнт паставіў на вялікай селектарнай нарадзе. Увогуле ад усіх цяпер патрабуецца максімальная аддача, бо ад гэтага залежыць наша харчовая бяспека. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы асобна звярнуў увагу на тое, што людзям, якія працуюць на жніве, трэба годна заплаціць, накарміць іх своечасова, арганізаваць адпачынак і вольны час.

Як выконваюцца пастаўленыя задачы, вырашыла паглядзець карэспандэнт «Звязды», адправіўшыся ў Чэрвеньскі раён, што на Міншчыне. А дакладней — у сельскагаспадарчы вытворчы філіял «Новыя Зелянкі» ААТ «Мінскі малочны завод № 1», што размешчаны на тэрыторыі Руднянскага сельскага савета.

### ЛЮБОЎ ЛЮБАМІРА МІХАЙЛАВІЧА

Прыехаўшы на поле, адразу сустрэліся з **камбайнерам-ветэранам Любамірам СЕРГІЕНЕМ**, «злавіўшы» яго літаральна «на парозе» кабіны вялізнага гомсельмашаўскага камбайна. «Гаварыць няма часу! Працаваць трэба, пакуль зноў дождж не пайшоў», — ён пагадзіўся пагаварыць са мной літаральна некалькі хвілін.

Для хлебароба сёлета стартаваў 40-ы ўборачны сезон. Папрасіла Любаміра Міхайлавіча крыху расказаць, як жа так атрымалася — столькі гадоў у полі, і з усмешкай, у бадзёрым настроі. Тлумачэнне простае: чалавек любіць тое, чым займаецца: «Я тут з 1985-га года працую. Жонка раней была памочніцай камбайнера, а зараз на ферме. І сын таксама, уяўляеце, з юных гадоў тут, на ўборачнай. Цяпер кажа: «Гэта ты мяне заразіў: працу сваю любіць».

Падчас размовы некалькі разоў падымала вочы ўверх, дзівячыся маштабам тэхнікі, на якой працуе механізатар. Камбайн з зямлі, калі стаіш побач, — неверагодных памераў, нездарма яго вобразна называюць караблём. Убачыўшы мой ашаломлены позірк, Любамір стаў расказваць, што ад машыны насамрэч залежыць вельмі многае: «У нас вельмі добрыя камбайны, магутныя, якасныя. Працаваць — адно задавальненне. Што датычыцца заробку ў гарачы сезон, скажу так: не крыўдзяць. Ленавацца не трэба, тады ўсё будзе: і ўраджай добры, што самае галоўнае, і прыбытак. Адзінае, на што паўплываць немагчыма, — надвор'е».

Са слоў **галоўнага агранома Наталлі САХОНЧЫК** ужо ведала, што мой суразмоўца — чалавек адказны і сціплы. Зрэшты, гэтыя якасці перадаліся і сыну Дзмітрыю, з якім мы таксама пазнаёміліся. Бачу — едзе яшчэ адзін велізарны айчынны камбайн GS12A1 PRO. «Сынок пад'язджае!», — з гордасцю гаворыць Любамір Міхайлавіч, пакуль я ўглядаюся, спрабуючы разабрацца, хто сядзіць высока за рулём.

СТАР. 3

НА КАНТРОЛІ

# БЕЗ СТРАТ І Ў КАРОТКІЯ ТЭРМІНЫ

## Сёлета мяркуецца сабраць 11 мільёнаў тон збожжа



Учора быў пераадолены рубеж у першы мільён тон сабранага збожжа. Усяго ж аграрыі чакаюць сёлета высокі ўраджай — каля 11 мільёнаў тон. Пакуль жніво не выйшла на поўныя абароты — перашкаджаюць штодзённыя дажджы. Аднак, як завяраюць спецыялісты, увесь ураджай будзе сабраны без страт, а харчовая бяспека — забяспечана. Адметна, што інтэнсіўныя дажджы нават спрыяюць росту ўраджайнасці некаторых культур, у прыватнасці цукровых буракоў. Што датычыцца «другога хлеба», то сёлетняе надвор'е выпрабоўвае і бульбу, і аграрыяў на трываласць. Амаль ва ўсіх рэгіёнах ужо праведзены трохразовыя апрацоўкі гэтай культуры ад фітапатагена, а на Брэстчыне, Гродзеншчыне і Магілёўшчыне прыступілі да чацвёртай апрацоўкі, што дазваляе не сумнявацца: будзем з ураджаем. Тым больш што экстрэмальныя катаклізмы надвор'я прывучылі аграрыяў на любы выклік рэагаваць імгненна.

СТАР. 3

З НАГОДЫ

# НЕ ПРАМАРГАЦЬ СІТУАЦЫЮ НА СПАЖЫВЕЦКІМ РЫНКУ

## Прадстаўнікі гандлю пра жорсткія меры і перавагі сучаснага пакупніка

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) сумесна з урадам выпрацавала шэраг мер, каб выключыць сітуацыі з адсутнасцю якаснай бульбы ў шэрагу магазінаў , якія здарыліся сёлетняй вясной. Пра гэта на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню работнікаў гандлю, заявіла намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Святлана КАРАТКЕВІЧ. Падпісаны Указ кіраўніка дзяржавы, у адпаведнасці з якім стабілізацыйныя фонды, якія штогод фарміруюцца, пераходзяць у сістэму дзяржзаказу.

СТАР. 5



ЗДАРОЎЕ

# ТЫ — ТОЕ, ШТО ЯСІ?

## Здаровае харчаванне без фанатызму і нуды



Штодзённыя харчовыя звычкі фарміруюцца з дробязяў: кава без сняданку, печыва падчас працы, хуткі абед «на хаду», позняя вячэра. І калі гаворка заходзіць пра здаровае харчаванне, уяўленне часта малюе нешта складанае, патрабавальнае і не заўсёды дасягальнае. Але ў аснове зусім іншае — разуменне, што мы ядзім, навошта, і як гэта ўплывае на нас.

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

25140>

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.

Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ВА ЎРАДЗЕ

# РОСТ ДАБРАБЫТУ НАСЕЛЬНІЦТВА



Фота БелТА.

## Прэм'ер-міністр — аб мэтах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступны год

Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН расказаў аб мэтах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026 год на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

«2026 год — год запуску новай пяцігадовай праграмы, і прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця павінен быць нацэлены ў першую чаргу на выкананне яе задач, адпавядаць патрабаванням эканамічнай бяспекі і фарміраваць умовы для далейшага росту дабрабыту насельніцтва», — сказаў Аляксандр Турчын.

У цэлым на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна былі разгледжаны праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, мэтавых паказчыкаў грашова-крэдытнай палітыкі і рэспубліканскага бюджэту на 2026 год.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗНЕШНІЯ ЎПЛЫВЫ І САНКЦЫІ, ПРАВОДЗІМ САВЮ НЕЗАЛЕЖНУЮ ПАЛІТЫКУ

### Якія пытанні абмяркоўвалі парламентарыі Беларусі і Ірана?

Як паведамляла «Звязда», у нашай краіне з візітам знаходзіцца іранская парламенцкая дэлегацыя на чале з кіраўніком рабочай групы Сходу ісламскага савета Ірана па супрацоўніцтве з Нацыянальным сходам Беларусі Аліасгарам Багерзадэ. У сераду іранскіх парламентарыяў сустракалі ў Савеце Рэспублікі. Падчас сустрэчы бакі абмяркоўвалі гандлёва-эканамічнае, гуманітарнае і міжпарламенцкае супрацоўніцтва.



Фота БелТА.

«Палітыка, якая праводзіцца ў нашых краінах, накіравана, перш за ўсё, на захаванне суверэнітэту, незалежнасці, шмат у чым дзякуючы мудрасці прэзідэнтаў нашых краін, — заявіла на сустрэчы **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Мы вельмі цэнім тыя ўзаемаадносіны, якія складваюцца паміж нашымі народамі і краінамі, разумеючы, што Іран — гэта дружалюбны нам народ. Наша знешняя палітыка, перш за ўсё, — гэта шматвектарнасць. Яна накіравана на падтрымку традыцыйных і культурных каштоўнасцяў, якія ёсць у нашых краінах».

Паводле слоў спікера, Беларусь і Іран, нягледзячы на ўсе складанасці, праводзяць сваю незалежную палітыку, не паддаючыся ні на якія знешнія ўплывы і санкцыі. Наталля Качанава таксама акцэнтавала ўвагу на развіцці міжпарламенцкага ўзаемадзеяння: «Ваш візіт — гэта яшчэ адно пацвярджэнне таму, што нашы парламентарыі супрацоўнічаюць. Я ўпэўненая, што ён надасць новы імпульс нашаму супрацоўніцтву».

Як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва Савет Рэспублікі зацікаўлены ў развіцці рэгіянальнага ўзаемадзеяння з Іранам. «У нас ёсць вельмі добрыя прыклады супрацоўніцтва паміж нашымі рэгіёнамі. І я спадзяюся, што мы і далей будзем рухацца ў гэтым кірунку», — адзначыла Наталля Качанава. Яна дадала, што для беларускага боку вельмі важна гандлёва-эканамічнае, інвестыцыйнае ўзаемадзеянне: «І тое, што сёння ў нас дзейнічае добрая дагаворная база, якая налічвае больш за 45 падпісаных пагадненняў і кантрактаў, па-мойму, — гэта добры падмурак для далейшага супрацоўніцтва. Я ўпэўнена, што мы знойдзем агульныя эканамічныя інтарэсы для далейшага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, а магчыма — і для стварэння сумесных вытворчасцяў і прадпрыемстваў».

У сваю чаргу **кіраўнік рабочай групы Сходу ісламскага савета Ірана па супрацоўніцтве з Нацыянальным сходам Беларусі Аліасгар БАГЕРЗАДЭ** падкрэсліў: « У нас вельмі добрае ўзаемадзеянне ў палітычнай, эканамічнай, культурнай і навуковай сферах. Мы таксама зацікаўлены пашыраць гэтае ўзаемадзеянне». Ён таксама адзначыў паспяховае супрацоўніцтва паміж нашымі парламентамі ў рамках міжнародных арганізацый.

У размове з журналістамі іранскі парламентарый адзначыў, што палітыка нашых краін накіравана на захаванне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці: «У хуткім часе чакаецца візіт Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусь. Я лічу, што гэты візіт стане пераломным момантам, надасць новы імпульс развіццю нашых адносін, рэалізацыі розных праектаў у эканамічнай, навукова-даследчай і медыцынскай сферах». Асаблівая ўвага, паводле слоў парламентарыя, падчас сустрэчы ў Савеце Рэспублікі была нададзена развіццю гуманітарнай сферы, у тым ліку абмену студэнтамі, рабоце над рознымі сумеснымі даследчымі праектамі. Абмяркоўвалася і аднаўленне прамых авіязносін паміж нашымі краінамі.

### У тэму

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей АЛЕЙНІК** падкрэсліў, што супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі праверана часам: «Яно датычыцца практычна ўсіх сфер нашага ўзаемадзеяння. У ходзе сустрэчы мы закранулі многія пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння. У першую чаргу — гандлёва-эканамічнае. Гэта аснова, падмурак нашых адносін. За апошнія тры гады агульны тавараабарот павялічыўся на 30 %. Аб'ёмы беларускага экспарту таксама прыраслі ў некалькі разоў. Гэта добрая дынаміка дазваляе нам разлічваць на далейшае павелічэнне аб'ёмаў узаемнага гандлю і аб'ёмаў эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва».

Закранулі і тэму двухбаковай дагаворна-прававой базы адносін. «За гады нашых дыпламатычных стасункаў падпісана каля 45 двухбаковых дакументаў. Сёння ў рабоце знаходзіцца яшчэ каля 10. Іх мы спадзяёмся і разлічваем падпісаць на працягу гэтага года. Яны датычацца розных сфер узаемадзеяння ў галіне транспарту, аховы здароўя, супрацоўніцтва ў сферы лясной гаспадаркі, інвестыцый і многіх іншых напрамкаў. Важнае значэнне мы надаём і міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву. Сёння тры вобласці Беларусі маюць партнёрскія адносіны з правінцыямі Ірана. Тры нашы гарады — Мінск, Гомель і Магілёў — маюць пабрацімскія адносіны з гарадамі Ірана. У працы знаходзіцца шэраг дакументаў, які звяжа яшчэ тры вобласці Беларусі з правінцыямі Ірана. І, вядома, мы бачым сур'ёзны патэнцыял у паглыбленні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі».

Як адзначыў с**таршыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей РАЧКОЎ,** дэлегацыя ісламскай краіны здзейсніла вельмі важны візіт з пункту гледжання геапалітычнай сітуацыі: «Іран выступае ў якасці нашага сур'ёзнага партнёра і сябра, мы развіваем стратэгічнае партнёрства. Нас аб'ядноўвае з Іранам тое, што мы з'яўляемся паўнапраўнымі членамі ШАС, а з 2025 года мы пачалі ўдзельнічаць практычна ва ўсіх мерапрыемствах БРІКС у якасці партнёраў дадзенага міждзяржаўнага аб'яднання. У цэлым Іран вельмі зацікаўлены ў паглыбленні супрацоўніцтва з Беларуссю абсалютна па ўсіх кірунках: ад палітыкі да эканомікі, інвестыцыйнага ўзаемадзеяння і парламенцкай дыпламатыі».

Паводле яго слоў, падчас перагавораў іранскі бок запрасіў яшчэ раз уважліва паглядзець на парты, якія ёсць у Іране, для таго, каб выкарыстоўваць лагістычныя магчымасці гэтай краіны для прасоўвання тавараў Беларусі на рынкі краін Блізкага Усходу, Азіі, Афрыкі: «Іранцы вельмі зацікаўлены ў развіцці сфер паслуг, а мы зацікаўлены ў развіцці як медыцынскага турызму, так і сферы адукацыйных паслуг. І тут мы бачым велізарны патэнцыял. Мы гатовыя да арганізацыі прамых авіязносін, але для гэтага павінны быць выкананы найважнейшыя умовы, звязаных з забеспячэннем бяспекі».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ХТО ПЕРАМАГАЕ Ў БІТВЕ ЗА ЎРАДЖАЙ




Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Іван МАРКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў,** амаль усё жыццё прысвяціў сельскай гаспадарцы. Ён вылучыў тры прынцыповыя аспекты, неабходныя для паспяховага правядзення ўборачнай кампаніі, на якія на нядаўняй селектарнай нарадзе звярнуў увагу — звярнуў? — звяжаў і кіраўнік дзяржавы. Гэта поўная гатоўнасць сельскагаспадарчай тэхнікі, гнуткая арганізацыя працы (неабходнасць прымянення нестандартных рашэнняў для кампенсацыі іншых рызык, уключаючы работу ў некалькі змен і максімальнае выкарыстанне светлавога дня), эфектыўнае стымуляванне ўсіх удзельнікаў жніва. «Дзяржава ў поўным аб'ёме выканала свае абавязацельствы па забеспячэнні ўборачнай кампаніі. Тэхніка падрыхтавана, ГЗМ і запчасткі завезены, фінансаванне забяспечана. Цяпер справа за непасрэднымі выканаўцамі — ад кіраўнікоў гаспадарак да кожнага механізатара, — заўважыў Іван Маркевіч. — Гістарычны вопыт даказвае: беларускія аграрыі здольныя вырашаць самыя складаныя задачы. Упэўнены, што і сёлета, мабілізаваўшы ўсе рэсурсы і захоўваючы зададзены Прэзідэнтам настрой, дасягнуць не толькі планавых паказчыкаў, а і больш высокага іх узроўню».

Уборачная кампанія — сам па сабе працэс адказны і няпросты. Не абыходзіцца і без праблем, вядома. Галоўнае іх не замоўчваць, не ўтойваць, а разам вырашаць. Таму, збіраючы нарады, заслухоўваючы даклады, выязджаючы ў палі, Аляксандр Лукашэнка заклікае не бравіраваць дасягненнямі, а гаварыць аб праблемах і недахопах.

«Прэзідэнтам былі вылучаны ключавыя асаблівасці правядзення жніва. Аб'ектыўная рэальнасць, якую нам падае надвор'е, павінна быць скарэкціравана дысцыплінай і правільна выбудаванай стратэгіяй уборкі ўраджаю. Менавіта ў такіх умовах і праяўляецца наш прафесіяналізм і стойкасць. Сучасны ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі дыктуе неабходнасць укаранення новых тэхналогій і строгага захавання працоўнай дысцыпліны. У цэлым паспяховая ўборачная кампанія патрабуе комплекснага падыходу, які спалучае ў сабе гатоўнасць інфраструктуры, прафесіяналізм супрацоўнікаў і кантроль усіх этапаў работ», — падкрэсліў **Аляксандр БАГЕЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага».**



Сёлета, вядома, надвор'е падкінула аграрыям новы выклік. Веснавыя замаразкі, нізкія тэмпературы і праліўныя дажджы зусім не спрыяюць рабоце ў палях. Але скардзіцца на надвор'е і апраўдваць праблемы толькі ім — недапушчальна, падкрэслівае Прэзідэнт. У рэшце рэшт пры правільным падыходзе любыя рызыкі можна і трэба мінімізаваць.

«Патрабаванні кіраўніка дзяржавы абсалютна справядлівыя: ва ўмовах непрадказальнага надвор'я і жорсткіх тэрмінаў патрэбна мабілізацыя ўсіх рэсурсаў, кантроль выканання тэхналагічнай дысцыпліны і персанальная адказнасць кіраўнікоў усіх узроўняў. Ключавыя моманты, што патрабуюць неадкладнага кантролю: тэхніка і яе своечасовы рамонт, наяўнасць паліва, сушка збожжа, дысцыпліна і кадры, якія павінны быць забяспечаны ўсім неабходным, уключаючы матывацыю. Упэўнены, што традыцыйная беларуская арганізаванасць і працавітасць дазволяць паспяхова завяршыць уборачную ў вызначаныя тэрміны», — канстатаваў **Андрэй БАЛЫШ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў.**



«Усё залежыць ад арганізацыі працы напярэдадні і падчас уборачнай кампаніі. Там, дзе тэхніка знаходзіцца ў поўнай гатоўнасці да палявых работ, забяспечана гаручым і запаснымі часткамі, дзе сельгаспрадпрыемствы ўкамплектаваны кваліфікаванымі механізатарамі, а зернесушыльныя комплексы ўжо сёння гатовы прыняць збожжа новага ўраджаю, — там уборачная пройдзе якасна і без страт. А гэта, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, найважнейшая на сённяшні дзень дзяржаўная задача. Для вырашэння яе ў апошнія дзесяцігоддзі былі выдаткаваны значныя фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы, якія дазволілі вывесці айчынную сельскую гаспадарку на новы тэхналагічны ўзровень, — звярнула ўвагу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА.** — Дзякуючы ўкараненню найноўшых тэхналогій нароўні з захаваннем найлепшага, што існавала ў аграрным сектары СССР, Беларусь дасягнула значных поспехаў на постсавецкай прасторы. І не толькі забяспечыла ўласную харчовую бяспеку, але іператварыла экспарт прадуктаў харчавання, якія вызначаюцца высокай якасцю, у вельмі прыбытковы артыкул бюджэту. Пацвярджаючы тым самым ключавы тэзіс, вылучаны Аляксандрам Лукашэнкам падчас нарады, — лепш жаць хлеб, чым ваяваць. Прычым, лепш для ўсіх у гэтым свеце».



## ХЛЕБ — СІМВАЛ ЖЫЦЦЯ І МІРУ

Магчыма, параўнанне мірнай уборкі ўраджаю і вайны не самае правільнае. Але ж і там, і там перамагае той, хто лепей падрыхтаваны, хто задзейнічаў усе рэсурсы і ваюе ад світання да світання, звяртаў увагу Прэзідэнт. **Член пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар Інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» Ірына ПЕТРУСЕВІЧ** падкрэсліла, што заклік кіраўніка дзяржавы змагацца на хлебнай ніве, каб не ваяваць на полі бою, сёння як ніколі актуальны. «Гэта не проста прыгожая метафара, а глыбокае разуменне таго, што харчовая бяспека і стабільнасць — падмурак міру і дабрабыту. І менавіта цяпер, у перыяд уборачнай кампаніі, гэта разуменне павінна трансфармавацца ў канкрэтныя дзеянні і максімальную ўвагу да сельскагаспадарчага сектара. Хлеб — не проста прадукт харчавання. Гэта сімвал жыцця, працы, ураджаю і, у канчатковым выніку, міру. Ураджай — гэта вынік карпатлівай працы земляробаў, іх сувязі з зямлёй і прыродай, — адзначыла сенатар. — Гісторыя памятае мноства прыкладаў, калі недахоп харчавання станавіўся прычынай сацыяльных выбухаў. Таму сёння хлеб, сабраны працавітымі рукамі беларускіх аграрыяў, — гарантыя таго, што краіна зможа пракарміць сваё насельніцтва. Беларусь здольная забяспечыць сябе харчаваннем. Адзін з прыярытэтаў нашай дзяржавы, непарушны і вечны, — забеспячэнне народа базавымі жыццёвымі дабротамі, у першую чаргу — хлебам. У гэтым простым, але глыбокім паняцці крыецца сапраўдны сэнс патрыятызму».



Нязменнае патрабаванне Прэзідэнта — не страціць ні адзінага каласка, ні аднаго зярнятка падчас уборкі. Прынамсі, каму як не аграрыям дэманстраваць краіне ўзор гаспадарлівасці. Ды і збожжа для нас — прадукт сапраўды стратэгічны. Гэта ў першую чаргу хлеб, які ўсяму галава. Але не толькі. Гэта ўніверсальная сыравіна, з якой можна атрымаць мноства карысных і неабходных прадуктаў для чалавека і жывёлы, што важна не толькі для Беларусі, але і для іншых (калі не ўсіх) краін свету. «Нашы прадукты добра ведаюць і любяць далёка за межамі Беларусі. Скажу больш. Ва ўмовах незаконных фашысцкіх беспрэцэдэнтных санкцый, якія апошнія гады ўводзяцца супраць нашай дзяржавы, менавіта экспарт сельгаспрадукцыі даў астатнім галінам магчымасць адаптавацца да новай сітуацыі і пераарыентавацца на іншыя рынкі збыту», — заявіў Прэзідэнт на ўрачыстай цырымоніі ўшанавання аграрыяў на «Дажынках-2024» у Мікашэвічах.

«Даступнасць якасных прадуктаў харчавання — аснова здароўя нацыі і сацыяльнай стабільнасці. Ураджай, сабраны своечасова і з мінімальнымі стратамі, дазваляе стрымліваць рост цэн і забяспечваць харчаваннем усе рэгіёны краіны. Гэтаму стратэгічна важнаму перыяду кіраўнік дзяржавы ўдзяляе асаблівую ўвагу, — адзначыла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, начальнік філіяла ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» у Гродне Алена СТАЛЬБОЎСКАЯ.** — Ураджай — наша сіла, наша ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Ігнараванне гэтай задачы можа прывесці да сур'ёзных наступстваў, падрываючы эканамічную стабільнасць і ставячы пад пагрозу дабрабыт грамадзян. Надвор'е — капрызнае і кожны год ставіць перад аграрыямі новыя выклікі. Але ніякія ўмовы надвор'я не могуць служыць апраўданнем для невыканання пастаўленых задач. Граматнае планаванне, аператыўнае рэагаванне на змены, выкарыстанне сучасных тэхналогій — вось што дазваляе дамагчыся максімальных вынікаў нават у самых складаных умовах».



## ЧАС ВЫСОКАЙ АДКАЗНАСЦІ

Аляксандр Лукашэнка неаднойчы казаў, што галоўнае багацце нашай краіны — людзі. І адзін з самых каштоўных складнікаў гэтага багацця, безумоўна, аграрыі. Якія вырошчваюць культуры, клапоцяцца аб іх, збіраюць ураджай і нясуць адказнасць за тое, каб краіна не засталася галоднай. «Падчас уборачнай кампаніі мы бачым, якая важная зладжаная работа ўсіх удзельнікаў аграрнага сектара. Гэта час высокай адказнасці, калі кожны дзень на полі — гарантыя будучага ўраджаю і харчовай бяспекі краіны. Уборачная — не толькі збор збожжа, але і пацвярджэнне таго, што праца і намаганні аграрыяў даюць рэальныя вынікі. Важна захоўваць тэмп, кантраляваць якасць і не дапускаць збояў, каб завяршыць кампанію паспяхова і падрыхтавацца да наступнага года. Гэта работа паказвае сілу і патэнцыял нашага аграпраму, а таксама веру ў будучыню Беларусі», — падкрэсліла **Алена ХАМІЦЭВІЧ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў.**



Па традыцыі, усю пашану аграрыі атрымліваюць пасля ўборкі (падчас яе ў іх няма часу на ўрачыстасці) — «Дажынкі» ўжо сталі беларускім брэндам. Але і ў такія гарачыя месяцы Прэзідэнт патрабуе падтрымліваць людзей, клапаціцца аб іх. Гэтым актыўна займаюцца і Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, і мясцовыя ўлады, і прадстаўнікі дэпутацкага корпуса.

«Уборка ўраджаю — важны і адказны этап у сельскай гаспадарцы, і ўсебаковая падтрымка аграрыяў мае першараднае значэнне ў забеспячэнні харчовай бяспекі і эканамічнага дабрабыту нашай краіны. У гэты перыяд неабходна стварыць спрыяльныя ўмовы для ўдзельнікаў жніва: забяспечыць бесперабойную работу і своечасовы рамонт тэхнікі, бяспечныя ўмовы працы і адпачынку, якія напрамую ўплываюць на хуткасць і якасць уборкі, а таксама на здароўе і дабрабыт людзей, занятых у такой важнай справе. Гэта комплексная задача, якая патрабуе зладжанай работы мноства спецыялістаў і арганізацый, ад эфектыўнасці якой будзе залежаць канчатковы вынік — своечасовы збор ураджаю без страт», — гаворыць **Алег ЦЫЛЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па экалогіі і прыродакарыстанні.**



«На дадзены момант уборачная кампанія праходзіць у цэлым арганізавана ў большасці рэгіёнаў. Пачаты масавыя работы па ўборцы збожжавых і зернебабовых культур, а таксама рапсу. Асаблівая ўвага ўдзяляецца своечасовай уборцы ў раёнах з рызыкай перастою культур. Стан тэхнікі ў асноўным здавальняючы. У сітуацыі, якая склалася, усім беларусам на месцах трэба праявіць дысцыпліну, адказнасць і прафесіяналізм», — падзяліўся назіраннямі **Уладзімір ПАЎЛОЎСКІ, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, маладзёжнай і сямейнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў.**



Развітая сельская гаспадарка, якая забяспечвае харчовую бяспеку краіны, — гэта ўсё вялікая палітыка, накіраваная на клопат аб людзях. І не толькі ў пытаннях харчавання, але і ў цэлым спакойнага і мірнага жыцця. «Чалавецтва неаднаразова сутыкалася з сітуацыямі, калі канфлікт або адсутнасць харчавання прыводзілі да сур'ёзных сацыяльна-палітычных узрушэнняў у дзяржаве і грамадстве. І наша задача — забяспечыць ключавы базіс, які дасць нам магчымасць далей развіваць наша грамадства ў тых няпростых умовах, што складваюцца па ўсім свеце», — нагадаў **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін.** А палітычныя інтарэсы заўсёды падмацоўваюцца эканамічнымі. На гэта таксама звярнуў увагу эксперт: «Прэзідэнт пастаянна акцэнтуе ўвагу: наша задача — не проста пастаўляць сельгаспрадукцыю як сыравіну, а забяспечваць глыбокую перапрацоўку, каб прыбавачная вартасць была максімальнай. Менавіта стварэнне гатовых тавараў і іх экспарт даюць нам магчымасць добра зарабляць і спрыяюць росту дабрабыту грамадзян».



**Валерыя СЦЯЦКО.**

# БЕЗ СТРАТ І Ў КАРОТКІЯ ТЭРМІНЫ

## УРАДЖАЙ ВЫШЭЙШЫ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ

Як паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК**, сёлета ўборачныя плошчы збожжавых захаваныя на ўзроўні мінулага года і на полі паспявае дастойны ўраджай зерня. Гэта дазволіць забяспечыць уласную прадуктовую бяспеку ў частцы харчовага зерня, перапрацоўкі на сыравіну і дазволіць нарыхтаваць насенны матэрыял.

— Плошча пасеву азімых была захавана на ўзроўні мінулых гадоў. Гэта дае магчымасць утрымліваць паказчыкі на стабільным узроўні за кошт таго, што азімыя культуры маюць уласцівасць выкарыстоўваць вільготнасць вясенняга перыяду і фарміраваць важкі ўраджай пры працяглых засухах у маі—чэрвені. З улікам папярэдняга вопыту і магчымых высокіх вясенніх тэмператур сёлета было вырашана павялічыць пасевы кукурузы на зерне ў параўнанні з мінулым годам на 30 %. Паколькі гэта высокаўраджайная культура, стаўка была зроблена на атрыманне дадатковага намалоту, — праінфармаваў Мікалай Лешык

Што датычыцца каласавых і зернебабовых культур, да ўборкі якіх у краіне ўжо прыступілі, то прыклад азімага ячменю сведчыць, што сёлета ўраджай значна вышэйшы, чым летась, і аб'ёмныя паказчыкі па вытворчасці зерня, якія пастаўлены кіраўніком дзяржавы і ўрадам, здолеем выканаць.

— Азімы ячмень засталося ўбраць на плошчы каля 40 тысяч гектараў, аднак ужо зараз валавы аб'ём атрыманага зерня роўны ўсяму леташняму. Мы сабралі больш за 800 тысяч тон — плюс адчувальны. Такая ж тэндэнцыя і па завярэнні Акадэміі навук, і па назіраннях спецыялістаў праглядваецца па ўсіх пасевах каласавых культур, — падкрэсліў Мікалай Лешык. — Што датычыцца кукурузы, то ўмовы надвор'я, а менавіта выпадзенне ападкаў і больш высокая тэмпература прыводзяць да інтэнсіўнага яе росту і даюць падставы спадзявацца на высокі ўраджай на ўзроўні больш за 2 мільёны тон.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Зрушэнне тэрмінаў сёлетняй уборачнай кампаніі спецыялісты тлумачаць спрыяльнымі ўмовамі фарміравання высокага ўраджаю: важкі колас фарміруецца даўжэй. Ну, а штодзённае выпадзенне ападкаў уносіць свой негатыў і стрымлівае ад нарошчвання тэмпаў жніва.

## НА ПАЛЯХ — 120 ТЫСЯЧ АДЗІНАК ТЭХНІКІ

Як паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення тэхнічнага прагрэсу і энергетыкі, дзяржаўнага нагляду за тэхнічным станам машын і абсталявання мінсельгасхарча Станіслаў КАРПОВІЧ**, гатоўнасць да жніва па зернеўборачных камбайнах складае 98 %, па зернеачышчальна- сушыльных комплексах — 98 %. 97 % камбайнаў прайшлі дзяржаўны тэхнічны агляд і дапушчаны да ўдзелу ў дарожным руху падчас жніва.

**Шчыраваць на хлебнай ніве сёлета будзе 7 тысяч зернеўборачных камбайнаў, на рапсавых палях будуць задзейнічаны 4 тысячы прыставак для ўборкі культуры, а перапрацоўваць атрыманы ўраджай будуць 1800 зернеачышчальна-сушыльных комплексаў. Усяго падчас уборачнай кампаніі будзе працаваць 120 тысяч адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі рознага прызначэння. У аграрыяў маецца дастатковая колькасць запасных частак, якая дазволіць ліквідаваць любыя паломкі ў самыя сціслыя тэрміны. Своечасова выправіць няспраўнасці дапаможа і сетка дылерскіх цэнтраў холдынга «Гомсельмаш».**

— Усе зернеўборачныя камбайны з завода-вытворцы выходзяць аснашчанымі сцеблапад'ёмнікамі, якія дазваляюць убіраць палеглы хлеб. Натуральна, пры гэтым зніжаны хуткасны рэжым камбайна, але хлеб будзе ўбраны на 100 %, нават палеглы. Такім чынам страты будуць мінімізаваныя, — падкрэсліў Станіслаў Карповіч. — Адначасова ў Мінсельгасхарчы, камітэтах па сельскай гаспадарцы аблвыканкамаў створаны рабочыя групы па кантролі за якасцю ўборачнай кампаніі.

Традыцыйна спатрэбіліся на жніве і дадатковыя кадры, а гэта 2800 чалавек. Усе яны прыбылі ў гаспадаркі. Сёлета гэта ў тым ліку студэнты, навучэнцы і выкладчыкі аграрных навучальных устаноў, супрацоўнікі МУС і МНС. Амаль усе экіпажы камбайнаў ужо сфарміраваны. Адначасова будуць прыцягнуты дадатковы аўтатранспарт з прамысловых прадпрыемстваў, іншых галін, дапаможа і Міністэрства абароны.

— Сушыльныя комплексы дазваляюць увесь намалочаны за дзень ураджай перапрацоўваць — іх агульная прадукцыйнасць да 500 тысяч тон у суткі. Адначасова будуць выкарыстоўвацца магчымасці хлебапрыёмных прадпрыемстваў, — дадаў Станіслаў Карповіч.

Для бяспекі работ усе экіпажы абсталяваны сродкамі пажаратушэння і аказання першай дапамогі, а таксама для кожнага звяна маецца машына прыкрыцця, якая ў выпадку надзвычайнай сітуацыі забяспечыць ліквідацыю наступстваў інцыдэнту. Усяго на жніве будуць дзяжурыць 3200 адзінак пажарнай тэхнікі.

**Алена КРАВЕЦ.**



# «ЛЕНАВАЦЦА НЕ ТРЭБА, ТАДЫ ЎСЁ БУДЗЕ»

## ХЛЕБ ДЛЯ ХЛЕБАРОБАЎ

У ходзе размовы гляджу на гадзіннік — час набліжаецца да абеду. Таму, напэўна, Дзмітрый і прыехаў на стаянку, каб на нейкі час пакінуць транспартны сродак. Хутка сюды прыедзе машына з гарачай ежай і напоямі, якую ўсе чакаюць. «Як кормяць?» — пытаюся я. «Смачна!» — хорам адказваюць мне бацька з сынам. І расказваюць, што ў спякоту аграрыі ядуць у палі двойчы: у абед і ўвечары.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У меню прадстаўлены разнастайныя стравы: абавязкова ў наяўнасці суп, прычым сытны, густы, наварысты. Акрамя таго, каша або пюрэ. «Абавязкова мяса ці рыба, — дадаюць мужчыны. — Салаты таксама бываюць. А яшчэ аладкі, булачкі, піражкі, блінцы. Папіць — кампот ці чай». На пытанне, ці хапае, каб добра падсілкавацца, адказваюць станоўча. Аднак паколькі праца фізічная і вельмі энергазатратная — талеркі заўжды чыстыя.

З аграрыямі пагутарылі, а затым адправіліся да кухара Ірыны Шылы. У яе ёсць свабодная хвілінка, паколькі абеды ўжо гатовыя. «Колькасць порцый на дзень разлічваецца з раніцы. Механізатары бяруць пуцёўкі, і ўсіх, хто ў гэты дзень працуе ў полі, мы запісваем на абед, — расказала жанчына. — Ежа смачная, хатняя, скаргаў яшчэ не чула! Працую з 8 раніцы да 15, калі гатуем ежу на адзін прыём. Калі на два — да 18. Пасля прыгатавання абеды расфасоўваюцца ў тэрмасы і адпраўляюцца на машыне туды, дзе іх вельмі чакаюць. Ведаю, што харчаванне на палях арганізавана добра: і столікі ёсць, і сурвэткі, і мыйныя сродкі. А што яшчэ трэба?».

Спыталася, колькі каштуе для аграрыя адзін абед. «Звычайна арганізацыя плаціць 70 % ад кошту, работнікі — 30 %, — расказала **старшыня Чэрвеньскай раённай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Ларыса БАНДАРОВІЧ**. — Аднак ёсць дзве гаспадаркі ў нашым раёне, філіял «Сельскагаспадарчы комплекс «Вялікаполле» дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» і ААТ «Чэрвеньскі райаграсэрвіс», якія яны кормяць бясплатна. А ў ААТ «Запольскае» людзі, занятыя на палявых работах, аплачваюць 10% ад кошту».

Карацей, усе ўмовы для людзей створаныя, сілы і матывацыя працаваць ёсць. Яшчэ хочацца, каб надвор'е не падводзіла. Але з гэтым фактарам людзі, якія любяць сваю працу, абавязкова справяцца.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара.**



### Даслоўна

**Першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Васіль СЫСОЕЎ** днямі паведаміў, што ўборачная кампанія ў Мінскай вобласці пакуль не ўступіла ў поўную сілу, хоць больш за палову азімага ячменю ўжо ўбрана і ўраджайнасць дадзенай культуры на 5 ц/га вышэй леташняй. У сувязі з гэтым на ўзроўні Мінскай вобласці выпрацавалі стратэгію бягучага жніва з улікам тых патрабаванняў кіраўніка дзяржавы, якія прагучалі на вялікай селектарнай нарадзе.

У першую чаргу маецца на ўвазе павелічэнне працягласці працоўнага дня на ўборцы збожжавых культур. Гаворка ідзе пакуль не аб начной змене. Спецыфіка жніва такая, што без страт у позні час зразаць каласы можна толькі да дасягнення раслінамі пэўнага ўзроўню вільготнасці.

«Для нас важна сёння захаваць кожны каласок, кожнае зярнятка, — паведаміў Васіль Сысоеў. — Сярод патрабаванняў таксама — максімальнае знаходжанне камбайнаў на палях, выключэнне нерацыянальных перагонаў тэхнікі і вяртання на машынныя двары ў начны час. Гэта дазволіць тэхніцы як мага раней прыступаць да работы раніцай».

Важны момант — стымуляванне ўдзельнікаў жніва, у тым ліку матэрыяльнае. «Мы павінны забяспечыць усе ўмовы, каб яны адчувалі сябе камфортна. Сёння кожны хлебароб разумее ўсю адказнасць і максімальна настроены на працу», — запэўніў Васіль Сысоеў.

ПА СУТНАСЦІ

# ПОДЫХ ДАБРАБЫТУ



У Беларусі — жніво. Асаблівы, вельмі адказны час, бо хлеб — вяршыня доўгай працы, разуменне гэтага ў Беларусі не страцілі. Нават у заходнім свеце з яго схільнасцю да штучнага інтэлекту харчаванне становіцца атрыбутам якаснага жыцця. Кліматычныя катаклізмы і антыфермерская палітыка там толькі пагаршаюць сітуацыю. Няма былога багацця, а ежа ўвесь час даражэе. Таму навіны з палёў уплываюць на эканамічную сітуацыю ў любой краіне.

У нас АПК — адна з бюджэтаўтваральных галін. Як вядома, адзін аграрый забяспечвае работай 5-7 гараджан. Так што і сапраўды ў Палацы Незалежнасці адбыўся бадай што найважнейшы селектар лета. Ён быў заклікаццы, па-першае, вызначыць праблемы, па-другое — намеціць іх рашэнне. У Палацы сабраўся кіраўніцкі штаб краіны, на сувязі — аграрны пул усіх рэгіёнаў Беларусі.

Хлеб як зборная назва — вынік працы не толькі АПК. Бо гэта нацыянальная бяспека і артыкул даходаў. Важкі артыкул. Па 7-8 мільярдаў долараў за год. Запыт на беларускае харчаванне ва ўсім свеце велізарны. Толькі забяспечвай.

Зямля не проста ўрадлівы слой глебы. Праца ў сельскай гаспадарцы — жыццёвая філасофія. Але гэта яшчэ і бізнес у зоне рызыкоўнага земляробства. Гэта аксіёма. Яе трэба ведаць, але не ў якім разе не спісваць на яе свае няўдачы.

Каб вырасціць ураджай, патрэбны год, а страціць яго можна літаральна за некалькі дзён. Асабліва сёлета. Метэаралагічныя зводкі нагадваюць франтавыя — залевы, шквалістыя вецер — небяспечнае спалучэнне. У выніку паляганне пасеваў, вегетацыя пустазелля, прарастанне зерня. Прэзідэнт сітуацыю прагназаваў і патрабуе варушыцца без аглядкі на надвор'е.

Збожжа трэба «лавіць» да таго, як яно ляжа на зямлю. Няхай нават і з большай вільготнасцю. Вось у гэтым сэнсе жніво і з'яўляецца бітвай за ўраджай. Але, як вядома, лепш убіраць ураджай, чым ваяваць.

За гады незалежнасці АПК у Беларусі паднялі з каленяў. Паставілі на крыло. Цяпер трэба варушыцца. Роля дзяржавы — стратэгічныя праекты. А задачы аграрыяў — не адрывацца ад зямлі. Як бы пафасна не гучала, але для беларусаў зямля — аснова дабрабыту. А беражлівыя адносіны да яе — захаванне нацыянальнага кода. Так было заўжды. А зараз харчовая бяспека —яшчэ і гарантыя міру. Для таго каб нашу зямлю не пераворвалі гусеніцы танкаў, мы павінны ваяваць на самым мірным полі — аграрным.

Галоўнае, што ёсць такое разуменне, калі мы ўбіраем хлеб. Зараз гэта насамрэч ідэя кансалідацыі для ўсёй краіны. Нездарма Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў: жніво лепш, чым вайна. Калі над залацістай рунню, абдымаючы сваімі промнямі наваколле, за неабсяжную сцяну зялёнага лесу хаваецца сонца, мы адчуваем той подых дабрабыту — ён у паху калосся. Таму гучыць спрадвечнае, гаспадарскае — «у бой!» — гэта пра хлеб. І гэта галоўнае.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**


## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»

**__05 августа 2025 г.__ проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды. **Арендодатель имущества и организатор аукциона:** государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, тел. +375 (17) 516 80 64).

**Порядок проведения аукциона** определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

| № лота | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер арендной платы в БАВ* | Коэфф. спроса | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (бел. руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/2 (в здании специализированном складов с инв. № 500/С-5953 общ. пл. 202,8 кв. м) | 45,7 | 27,19/ **510,36 бел. руб.** | 1,7 | 214,45 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Склад 14. Отдельный вход. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 2 | г. Минск, ул. Промышленная, 9, здание проходной с инв. № 500/С-5951 общ. пл. 41,2 кв. м | 41,2 | 24,51/ **460,05 бел. руб.** | 1,7 | 193,33 | Любые цели, возможные на данных площадях | Здание проходной полностью. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 3 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/4, здание нежилое с инв. № 500/С-56343 общ. пл. 24,2 кв. м | 24,2 | 16,09/ **302,01 бел. руб.** | 1,9 | 113,56 | Любые цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение полностью. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 4 | г. Минск, ул. Казинца, 96А (151,1 кв. м в здании склада с инв. № 500/С-27043, общ. пл. 196,5 кв. м, 101,4 кв. м в здании склада с инв. № 500/С-27041, общ. пл. 135,9 кв. м, 68 кв. м административное здание с инв. № 500/С-17488 полностью) | 320,5 | 280,44 / **4 766,27 бел. руб.** | 2,2<br>2,2<br>2,5 | 1 503,95 | Любые цели, возможные на данных площадях | 4 помещения (41,2 кв. м, 49,3 кв. м, 32,2 кв. м и 28,4 кв. м) с отдельными входами в здании склада 500/С-27043<br>3 помещения (83,2 кв. м, 11,7 кв. м и 6,5 кв. м) с отдельным входом в здании склада 500/С-27041.<br>Административное здание полностью.<br>Имеется электроснабжение. Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 30, автомобильная стоянка с инв. № 500/С-67662 общ. пл. 10 879,2 кв. м (составные части и принадлежности: площадка под автостоянку, тротуар, ограждение, здание КПП, туалет) | 10 879,2<br>36<br>3,1 | **19 756,95 бел. руб.** | *-*<br>*3*<br>*(для КПП и туалета)* | 4 930,04 | Открытая площадка для хранения | Составные части и принадлежности: площадка под автостоянку (10 879,2 кв. м), тротуар, ограждение, туалет (3,1 кв. м), здание КПП (36 кв. м) |

**Без учета коэффициента для отдельных видов деятельности (устанавливается при наличии оснований).*
**Базовая арендная величина составляет 18,77 бел. руб., размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен*

**Аукцион состоится __05 августа 2025 г.__ в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 (актовый зал).**

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, **по __01 августа 2025 г.__ включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

Телефоны для справок: отдел аукционов — **+375 (17) 516 80 64,** инженер по обслуживанию помещений – **+375 (17) 516 80 63.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.rlt.by;** Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»)



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** | |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **15.08.2025, 12.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг»** | |
| | **Лот № 1** | **Лот № 2** |
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды недвижимого имущества – часть капитального строения с инвентарным номером 644/С-2769** | **Право заключения договора аренды недвижимого имущества – часть капитального строения с инвентарным номером 644/С-2769** |
| **Общая площадь, кв. м** | 739,8 | 346,4 |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленинского Комсомола, 22, 1 этаж с подвалом | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленинского Комсомола, 22, 2 этаж |
| **Характеристика недвижимого имущества и иные сведения** | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, подъездные пути | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, подъездные пути |
| **Условия аукциона** | **Целевое использование имущества – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, детских развлекательных аттракционов, оказания услуг (за исключением ритуальных), розничной торговли непродовольственными товарами; за исключением размещения объектов общественного питания, игорных заведений и аптек** | **Целевое использование имущества – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, детских развлекательных аттракционов, оказания услуг (за исключением ритуальных), розничной торговли непродовольственными товарами; за исключением размещения объектов общественного питания, игорных заведений и аптек** |
| **Начальная цена права заключения договора аренды объекта, бел. руб.** | 1 388,61 | 1 137,84 |
